А. А. Шамак

# Традыцыйная культура Беларусі: удакладненне зместу і структуры

*У артыкуле разглядаецца пытанне найбольш пэўнага вызначэння «традыцыйная культура» па змесце і структуры, апора на якое дае магчымасць кіраўнікам, якія працуюць у сферы культуры Рэспублікі Беларусь прымаць аптымальныя рашэнні.*

Культура як вынік жыццядзейнасці людзей з'яўляецца адным з галоўных фактараў грамадскага развіцця. Яна ўяўляе сабою складаную дынамічную сістэму, якая, у той жа час, утрымлівае стабільныя элементы культурнай спадчыны, дзякуючы чаму адбываюцца захаванне і перадача назапашанага досведу і традыцый. Менавіта традыцыі, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення, дазваляюць народу вызначаць сваю этнічную адметнасць і фарміруюць падсістэму традыцыйнай культуры, якая з'яўляецца важнай складовай часткай сучаснай нацыянальнай культуры. У сінхронным зрэзе культуры заўсёды прысутнічаюць элементы традыцыйнай культуры і адначасова не злучаныя з ёй сучасныя, а таксама пераходныя паміж імі формы культуры.

З'яву культуры, якую мы адзначаем паняццем «традыцыйная», вызначаюць у розных навуках іншымі паняццямі: «архаічная», «даіндустрыяльная», «аграрная», «сялянская», «дапісьмовая», «бытавая», «паўсядзённая» культура з шырока ўжывальным паняццем — «фальклор». Выбар метадалагічнага падыходу і паняційнага апарату даследавання вызначаецца даследчыцкімі задачамі, і з навуковага погляду, наяўнасць некалькіх найменняў адной з'явы ў розных навуках дапушчальна. Але нават тыя навуковыя дысцыпліны і даследчыкі, якія выкарыстоўваюць паняцце «традыцыйная культура», па-рознаму вызначаюць яго змест і структуру.

Лагічную структуру паняцця складаюць яго змест і аб'ём. Змест паняцця — сукупнасць істотных прыкмет прадмета ці класа аднастайных прадметаў, адлюстраваных у гэтым паняцці. Словы ці знакі, якія вызначаюць паняцце, з'яўляюцца навуковымі тэрмінамі.

Мы не будзем разглядаць у артыкуле ўсе магчымыя азначэнні паняцця «традыцыйная культура», прапанаваныя рознымі навукоўцамі, а вылучым з прынятых азначэнняў тыя элементы, да якіх часцей звяртаюцца даследчыкі. Гэта тэрмін — «традыцыя» і пералік элементаў структуры, якім напаўняюць паняцце традыцыйнай культуры.

Пад традыцыяй (ад *лат.* traditio — перадача) разумеюць «сукупнасць элементаў сацыяльнай і культурнай спадчыны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якая перадаецца ад пакалення да пакалення і захоўваецца ў пэўным грамадстве, класах і сацыяльных групах на працягу доўгіх часоў, ахоплівае аб'екты сацыяльнай спадчыны (матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці), а таксама працэс і спосабы яе перадачы» [7, *629*].

Традыцыя ў шырокім сэнсе слова — гістарычна склаўшаяся форма адлюстравання рэчаіснасці, якая стала нормай, што перадавалася ад пакалення да пакалення, дазваляла падтрымліваць сувязь паміж сучасным і мінулым.

Традыцыя — не бессэнсоўнае следаванне звычкам, а следаванне парадку, норме, якія выпрацоўваліся грамадствам стагоддзямі і ўвасаблялі вопыт пакаленняў. Зберажэнне традыцыі і ёсць парадак [1].

Традыцыя — неабавязкова нешта кансерватыўнае. Традыцыя абнаўляецца, а час ад часу знікае. У кожнай культуры традыцыйнага тыпу ёсць розначасовыя па сваім паходжанні традыцыі, прычым самыя новыя, не самыя актуальныя [8].

Неабходна адрозніваць паняцці «традыцыя» і «традыцыйнае». Э. С. Маркаран вызначае агульнае і адметнае ў паняццях «традыцыя» і «культурная традыцыя». На яго думку «традыцыя — спосаб фіксацыі ў сацыяльнай памяці, перадача, узнаўленне культуры», а «культурная традыцыя» — сацыяльны групавы вопыт, які набывае форму стэрэатыпу.

Традыцыйная культура мела вопытна-эмпірычны характар фарміравання і з'яўлялася вынікам жыццядзейнасці калектыву. У аснове любой традыцыі ляжыць вопыт той сацыяльнай групы, якой належыць традыцыя. З цягам часу з агульнага вопыту выбіраецца самая каштоўная частка і фіксуецца з дапамогай стэрэатыпу. Традыцыя — набор стэрэатыпаў, але, што важна, невыпадковы, а ўзаемазвязаны і ўзаемавыводзімы, бо толькі такая сістэма дазваляе забяспечыць пераход ад адной сітуацыі да другой.

Такім чынам можна прасачыць наступную схему фарміравання традыцыі: накапленне вопыту — адбор — стэрэатыпізацыя — перадача стэрэатыпу — яго ўзнаўленне. Калі стэрэатып узнаўляецца на працягу жыцця некалькіх пакаленняў, то можна гаварыць аб устойлівай традыцыі.

Элементы традыцыйнай культуры распрацоўваюцца і правяраюцца ўсёй гістарычнай практыкай. Яны камбінуюцца і ўдасканальваюцца праз адбор і развіццё лепшых з пазіцыі карыснасці для сацыяльнай групы і перадаюцца нашчадкам. Грамадства пільна сачыла за захаваннем каштоўнай часткі агульнай інфармацыі і кантралявала яе зберажэнне з дапамогай абраду, традыцый, якія з'ўляліся формай калектыўнай памяці і сродкам перадачы інфармацыі новым пакаленням [2, *17*].

Традыцыйная культура заўсёды мае этнічны змест і форму. Яна з'яўляецца калектыўным вопытам этнасу, вынікам яго адаптацыі ў адпаведных геаграфічных і прыродных умовах, падсумаваннем яго гістарычнага развіцця. Усе тэарэтычныя пасылы, выказаныя вышэй, у поўным аб'ёме дапасуюцца да традыцыйнай культуры Беларусі. Яна мае самае непасрэднае дачыненне да фарміравання нацыянальных культурных каштоўнасцей і менталітэту беларусаў.

У некаторых людзей паняцце традыцыйнай культуры выклікае аднабакова станоўчую рэакцыю. Яно і зразумела. Традыцыйная культура — падмурак нацыянальнай культуры і адмаўленне ад яе вядзе да страты самаідэнтыфікацыі, а за гэтым і дэградацыі нацыі.

Акрэсліўшы наш падыход да дэфініцыі тэрміна «традыцыя», вызначымся з аб'ёмам паняцця «традыцыйная культура». Аб'ём паняцця — сукупнасць прадметаў, якая мысліцца ў дадзеным паняцці. Тут таксама шмат варыянтаў пераліку элементаў, якія ўключалі ў змест паняцця «традыцыйная культура». За аснову мы возьмем пералік элементаў традыцыйнай культуры, які быў вызначаны міжнароднай супольнасцю навукоўцаў.

На нарадзе ўрадавых экспертаў па захаванні традыцыйнай культуры пры ЮНЭСКА, якая адбылася ў Парыжы 1 сакавіка 1985 г., было выпрацавана наступнае вызначэнне: «традыцыйная культура — калектыўная і заснаваная на традыцыях творчасць груп ці індывідаў, вызначаная надзеямі і спадзяваннямі грамадства, якая з'яўляецца адэкватным адлюстраваннем іх культурнай і сацыяльнай самабытнасці... Яе формы ўключаюць мову, вусную літаратуру, музыку, танцы, гульні, міфалогію, абрады, звычаі, рамёствы, архітэктуру і іншыя віды мастацкай творчасці».

Як бачна, пералік элементаў паняцця «традыцыйная культура» ахоплівае не толькі нематэрыяльныя віды традыцыйнай культуры, але і матэрыяльныя. Таму зводзіць традыцыйную культуру толькі да вусна-паэтычнай творчасці (фальклора) і злучанай з ёй абраднасцю нельга.

Абавязковым складнікам любой традыцыйнай культуры з'яўляецца матэрыяльна-рэчыўнае асяроддзе, якое ўключае адзенне, жыллё, ежу, прылады працы, прадметы побыту, дробную пластыку, — усё тое, што складае прадметны фон паўсядзённага жыцця людзей і характарызуе этнас.

Кожны з пералічаных элементаў традыцыі — гэта вынік стэрэатыпізацыі досведу сацыяльнай групы, захаванне і перадача яго наступным пакаленням. Этнографы лічаць, што для стэрэатыпізацыі і замацавання вызначанага досведу патрабуецца час, адпаведны жыццю 5—6 пакаленняў, што складае прыблізна 125—150 гадоў. Калі ўзяць за кропку адліку наш час і перанесці яе ў мінулае на 125—150 гадоў, то час актыўнага фарміравання традыцыі, з якой мы сутыкнуліся, прыпадае на перыяд другой паловы XIX ст., і з улікам інэрцыйнасці культуры яго можна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распаўсюдзіць на пачатак XX ст. Гэта значыць: тыя з'явы культуры і прадметы, якія былі створаны ў той перыяд жыццядзейнасці беларускага грамадства, павінны былі прайсці працэс стэрэатыпізацыі і быць для цяперашняга пакалення паўнаважкай традыцыяй ці знікнуць.

Канкрэтная гісторыка-культурная сітуацыя не спрыяла лагічнаму развіццю традыцыйнай культуры беларускага грамадства. Гістарычны эксперымент па перабудове грамадства і стварэнні новай пралетарскай культуры ў часы існавання СССР (1917—1991), — гэта спроба перапыніць працэс стэрэатыпізацыі з'яў культуры «старога буржуазнага грамадства», сфарміраваць і замацаваць у грамадстве новую пралетарскую культуру і камуністычныя традыцыі.

Гэты сацыяльны эксперымент даў вельмі павучальныя вынікі. Старыя традыцыі, нягледзячы на ўціск, зведалі пэўную дэфармацыю, але працягвалі, часам падспудна, існаваць і захоўвацца ў грамадстве, дажылі да нашых дзён. У той жа час, камуністычныя традыцыі, якія не прайшлі ўвесь цыкл стэрэатыпізацыі (нагадаем: камуністычная ўлада праіснавала ўсяго 70 гадоў) з развалам СССР, практычна імгненна, па гістарычных мерках, зніклі, хаця ў значнай ступені ў дэфарміраваным выглядзе прысутнічаюць у свядомасці пэўнага кола людзей і сёння.

Традыцыю вызначаюць па суб'ектам дзейнасці — носьбітам традыцыі. Адсюль традыцыйная культура як цэласная падсістэма складаецца з традыцыйных субкультур, якія сфарміравалі значныя сацыяльныя группы грамадства.

У навуковых даследаваннях другой паловы XX ст. пераважыла думка аб тым, што традыцыйная культура зводзілася да сялянскай. Аднак яна мела месца ў жыццядзейнасці розных класаў, сацыяльных слаёў і груп грамадства Беларусі другой паловы XIX — пачатку XX ст.

У межах этнаграфічнага і класавага падыходу да культуры ў перыяд СССР, да традыцыйнай культуры адносілі тыя элементы, якія былі створаны народам, пад якім разумеліся толькі пралетарскія слаі грамадства і, у першую чаргу, сялянства. Гэты падыход, сфармуляваны У. Я. Проппам [5] і закансерваваны марксісцка-ленінскай метадалогіяй, цалкам выключыў са зместу паняцця «традыцыйная культура» тыя субкультуры, якія належалі тагачаснаму прывілеяванаму класу былога беларускага грамадства — шляхце і, у значнай ступені, гараджанам.

***Асноўныя формы і віды традыцыйнай культуры ў межах аднаго класа ці сацыяльнай групы падтрымліваліся большасцю яго прадстаўнікоў, замацоўваліся ў сістэме паняццяў, маральных установак, ідэалаў, а таксама вобразаў, якія былі ўзорам для пераймання.***

Асноўныя формы і віды традыцыйнай культуры ў межах аднаго класа ці сацыяльнай групы падтрымліваліся большасцю яго прадстаўнікоў, замацоўваліся ў сістэме паняццяў, маральных установак, ідэалаў, а таксама вобразаў, якія былі ўзорам для пераймання. Кожная сацыяльная група мела сваю асабістую традыцыю ў сферы культуры, лічыла яе ўнікальнай, і гэта сапраўды было так. Кожная сацыяльная група свядома абараняла сваю манаполію на веды пэўнага тыпу і практычную недасягальнасць такіх ведаў для іншых груп.

Усе згаданыя складовыя ці большасць з іх прысутнічалі ва ўсіх групах беларускага грамадства другой паловы XIX — пачатку XX ст. Не прызнаваць гэтага, значыць заставацца на пазіцыях марксісцкай, класавай метадалогіі. Пакідаючы для даследавання і падтрымліваючы толькі субкультуру адной сацыяльнай групы, мы збядняем культуру нацыі ў цэлым.

«Кожны сацыяльны пласт» ствараў блізкае яму мастацтва і, адпаведна, у кожным соцыуме існавала свая традыцыйная культура, якая абслугоўвала гэты клас. Пры гэтым у кожнай субкультуры фарміруецца адпаведная выява свету і адмысловы лад жыцця, які адпавядае запатрабаванням соцыуму [6, *14*].

Падводзячы вынікі разгляду традыцыйнай культуры з пазіцый яе суб'ектаў, мы павінны адносіць да традыцыйнай культуры лепшыя, захаваўшыя сваю каштоўнасць для сучаснага беларускага грамадства элементы культуры канца XIX — пачатку XX ст., якія неабходна падтрымліваць, каб яны змаглі ў поўнай меры прайсці працэс стэрэатыпізацыі.

Органы дзяржаўнага кіравання культурай павінны ўлічваць запатрабаванні новага часу, ініцыятывы асобных соцыумаў па адраджэнні іх колішніх традыцый. Прыватная ўласнасць, рыначная эканоміка адраджаюць і фарміруюць эканамічна прывілеяваны сярэдні клас. Нашчадкі дваранства і шляхты ўзгадваюць пра сваіх продкаў і іх традыцыі. Аднаўленне элементаў культуры і традыцый, зварот да лепшых традыцый заможнага класа, які ўсведамляе сябе часткай нацыі — аб'ектыўная задача пры ўсёй яе суб'ектыўнасці. А наперадзе яшчэ фарміраванне сярэдняга класа і рашэнне яго культурных запатрабаванняў. Асобныя элементы культурнага жыцця мястэчак Беларусі могуць быць выкарыстаны ў вызначэнні прыярытэтаў культурнага будаўніцтва ў сучасных аграгарадках.

Складовай часткай аднаўлення традыцыйнай культуры становіцца вяртанне ў паўсядзённую культуру прадметаў матэрыяльнага асяроддзя. Для этнасу (этнічнай агульнасці) найболей значнымі з'яўляюцца элементы побытавай культуры, у той час як прафесійная культура па змесце шмат у чым інтэрнацыянальная.

Знаходзячыся ў сістэме сучаснай культуры, традыцыйная куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тура, як падсістэма, павінна мець сувязі з іншымі элементамі, займаць сваё месца, выконваць свае функцыі, абменьвацца зместам, інакш яна будзе адрынута сістэмай за непатрэбнасцю. Але гэта не толькі аб'ектыўны працэс змены адной традыцыі іншай, у ім прысутнічае і аказвае значны ўплыў на гэтыя працэсы суб'ектыўны фактар. Яго фарміруюць навуковыя, дзяржаўныя дзеячы, палітыкі, сродкі масавай інфармацыі, якія курыруюцца групамі суб'ектаў (ці нават адным, суб'ектам), якія маюць значныя фінансавыя сродкі.

Традыцыйная культура ўяўляе нарматыўна-каштоўнасную сістэму жыццезабеспячэння этнічнай супольнасці. Гэта сістэма ўключае ў сябе сацыяльныя, рэлігійна-этычныя, эстэтычныя і іншыя нарматыўна-каштоўнасныя ўяўленні груп грамадства, рэгулюе жыццё супольнасці з дапамогай рэгламентаваных норм, па якіх будаваліся разнастайныя сацыяльныя адносіны.

Традыцыйная культура з'яўляецца галоўным элементам ідэнтыфікацыі, якая дазваляе чалавеку аднесці сябе да той ці іншай этнічнай супольнасці. Сярод падстаў, па якіх чалавек вызначае сваю этнічную прыналежнасць, вылучаюць мову, нацыянальнасць бацькоў, агульнае гістарычнае мінулае, рэлігійна-канфесійную прыналежнасць.

У межах культуралагічнага падыходу можна вызначыць традыцыйную культуру ў якасці сродка аднаўлення такога суб'екта гістарычнага дзеяння, як калектывісцкая асоба. Індывіды падобнага тыпу атасаямліваюць сябе з сацыяльнай групай, усе прадстаўнікі якой аб'яднаны агульнасцю культурных сувязей і механізмаў жыццядзейнасці. У такіх групах пануюць калектывісцкія сацыяльныя ўяўленні, якія прадугледжваюць няўхільнае выкананне традыцыйных норм паводзін, але не выключаюць магчымасць праяў індывідуальнай асобаснай волі.

Істотнай якасцю традыцыйнай культуры, як лічаць некаторыя навукоўцы, з'яўляецца яе здольнасць функцыянаваць па-за інстытуцыянальна-арганізацыйнымі формамі дзяржавы. Гэта «культура пераважна вуснай традыцыі, якая існавала ў мінулым і існуе ў наш час па фальклорным тыпе: перадаецца ад асобы да асобы, ад пакалення да пакалення ў акце непасрэднай камунікацыі» [1].

Зыходзячы з усяго вышэйсказанага і падводзячы вынікі разгляду вызначанай праблемы, ёсць магчымасць выказаць наступныя меркаванні:

— традыцыйная культура — падсістэма сучаснай культуры, якая забяспечвае ўзнаўленне тых узораў мінулай культуры (адлеглай на 125—150 гадоў ад цяперашняга часу), якія вытрымалі выпрабаванне часам і з'яўляюцца каштоўнасцю для сучасных груп грамадства, нацыі ў цэлым;

— у падсістэме традыцыйнай культуры беларускага грамадства амаль не прысутнічаюць элементы шляхецкай, гарадской і местачковай субкультур, што, безумоўна, не адлюстроўвае паўнавартасную панараму беларускай культуры ў цэлым; у той жа час латэнтныя працэсы ў сацыяльных групах, якія лічаць сябе спадкаемцамі гэтых субкультур, усё роўна будуць адбывацца;

— вызначаць падсістэму традыцыйнай культуры як *«народную»* — азначае стымуляваць барацьбу паміж рознымі сацыялагічнымі школамі, што даюць паняццю «народ» сваё вызначэнне; пра гэта добра выказаўся вядомы французскі сацыёлаг П. Бурд'е: «Каб некалькі растлумачыць дыскусію з нагоды «народа» ці «народнага», досыць падумаць, што «народ» ці «народнае» (народнае мастацтва, народная рэлігія, народная медыцына і г. д.) служыць у першую чаргу стаўкай у барацьбе паміж інтэлектуаламі»;

— дзейнасць навукоўцаў, якія выступаюць за захаванне, трансляцыю і лагічна абгрунтаваную эвалюцыю традыцыйнай культуры, павінна быць накіравана на фарміраванне разумення каштоўнасці традыцыйнай культуры ва ўсіх сацыяльных групах сучаснага грамадства; вядомы амерыканскі навуковец Ф. Боас лічыў, што «кожная культурная група мае сваю ўнікальную гісторыю, якая залежыць з большага ад своеасаблівага ўнутранага развіцця сацыяльнай групы, але і ад старонніх уплываў, якім яна падвяргаецца»; таму адным з найбольш дзейсных метадаў, па яго меркаванні, з'яўляецца «вывучэнне дынамічных змен» у асобных групах грамадства [3];

— відавочна, што ў сучасных умовах традыцыйная культура (у формах, якія склаліся гістарычна) шмат у чым перастала выконваць уласцівыя ёй у мінулым нарматыўна-рэгулятыўныя функцыі, тым не менш, яна зберагае і працягвае адыгрываць значную ролю ў сучаснай культуры Беларусі.

## Літаратура


1. *Афанасьев, В. Г.* Системность и общество/ В. Г. Афанасьев. — М., 1980.
2. *Байбурин, А. К.* Ритуал в традиционной культуре / А. К. Байбурин. — Л., 1993.
3. *Боас, Ф.* Задачи антропологического исследования / Ф. Боас // Советская этнография. — 1933. — № 3—4.
4. *Народная* культура в современных условиях. — М., 2000.
5. *Пропп, В. Я.* Русские аграрные праздники / В. Я. Пропп. — Л., 1963.
6. *Соколов, К. Б.* Субкультурная стратификация и городской фольклор / К. Б. Соколов // Традиционная культура. — 2000. — № 1.
7. *Традиция* // Философский энциклопедический словарь. — М. : Сов. энциклопедия, 1983.
8. *Чистов, К. В.* Народные традиции и общество / К. В. Чистов. — М., 1986.


## Summary

*The question of the most appropriate definition of «traditional culture» in content and structure is considered in this article. If the managers, who work in the sphere of culture of the Republic of Belarus, will be based on this concept, then they will be able to make optimal decisions.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ